**В.А.Касап**, *дацэнт*

# РОЛЯ І МЕСЦА ДАКУМЕНТАЗНАЎЧЫХ НАВУК У ПАДРЫХТОЎЦЫ СПЕЦЫЯЛІСТАЎ ВЫШЭЙШАЙ КВАЛІФІКАЦЫІ

Спецыяліст будучага павінен валодаць уменнямі аператыўна рэагаваць на пастаянна ўзнікаючыя змены ў практычнай і навуковай дзейнасці, грамадскай практыцы ў цэлым.

Сучаснае развіццё бібліятэчна-інфармацыйных навук прадвызначае новыя адносіны спецыялістаў да дакументаў як дынамічнай сістэмы, таму што яна складае аснову прафесіі і вызначаецца разнастайнасцю, варыятыўнасцю сваіх кампанентаў.

У педагогіцы вышэйшай школы існуе думка аб тым, што ў ВНУ вывучаюцца не навукі, а вучэбныя дысцыпліны. Па некаторых параметрах яны не супадаюць. Аб'ёмы курсаў, прапорцыі паміж тэарэтычнай і прыкладной часткамі залежаць ад мэт, задач навучання і месца, якое займае курс у сістэме падрыхтоўкі спецыялістаў. Галоўнай мэтай агульнапрафесійнай вучэбнай дысцыпліны з'яўляецца выхаванне ў студэнтаў патрэбнасцей і ўменняў выкарыстоўваць яе навуковы змест для вырашэння прафесійнай пазнавальнай задачы.

Курс «Дакументазнаўства» – гэта адносна маладая вучэбная дысцыпліна, уключаная ў вучэбны план Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры з 1989 года. У комплекс дакументазнаўчых дысцыплін уваходзяць, акрамя «Дакументазнаўства», таксама курсы «Гісторыя кнігі», «Кнігазнаўства», «Каталагізацыя дакументаў» і «Бібліятэчныя фонды». У якой жа ступені курс «Дакументазнаўства» адпавядае самой навуцы? Канец 90-х гадоў XX ст. адзначаецца бурнымі дыскусіямі аб месцы, ролі, змесце самой навукі «Дакументазнаўства». І хаця на сённяшні дзень ёсць як мінімум два падручнікі па «Дакументазнаўстве», вастрыня дыскусіі не змяншаецца. На старонках спецыяльнага друку найбольш актыўна выступаюць Ю.М.Сталяроў, Г.М.Швецова-Водка,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У.І.Цярэшын, Н.М.Кушнарэнка, В.А.Мінкіна, А.В.Сакалоў і інш. Актыўнасць удзельнікаў дыскусіі сведчыць, што яшчэ не да канца ўсталявалася сама навука, таму змест вучэбнай дысцыпліны адрозніваецца ў розных ВНУ (напрыклад, "Дакументазнаўства" ў планах падрыхтоўкі архівістаў, гісторыкаў і "Дакументазнаўства" для падрыхтоўкі бібліятэкараў-бібліёграфаў).

Ю.М.Сталяроў у апошніх работах 2000–2002 гадоў прапануе ўнесці змены не толькі ў кантэкст, але і ў назву навукі і вучэбнай дасцыпліны, якая павінна, на яго думку, называцца «Дакументалогія». Але не ўсе спецыялісты згодны з яго прапановамі. Так ці інакш дакументазнаўства існуе ў вучэбных планах і з'яўляецца агульнапрафесійнай дысцыплінай. Яе асноўная мэта – даць абагульненыя веды аб дакуменце. Прадметам дакументазнаўства з'яўляюцца асаблівасці ўсіх дакументаў сістэмы інфармацыйна-дакументных камунікацый і праблемы, звязаныя з іх жыццёвым цыклам: стварэннем, тыражаваннем, рэкламай, распаўсюджваннем, абаронай, захаваннем, выкарыстаннем. Такім чынам, курс "Дакументазнаўства" павінен закласці фундамент для далейшага развіцця спецыяльных дысцыплін.

Інтэграцыйныя сувязі курса «Дакументазнаўства» са спецыяльнымі дысцыплінамі праяўляюцца ў тэхналагічных і арганізацыйных аспектах.

У сувязі з далейшым асэнсаваннем навукай «Дакументазнаўства» сваёй спецыфікі і зацвярджэннем адукацыйных стандартаў была праведзена вялікая работа па перапрацоўцы новай вучэбнай праграмы па курсу «Дакументазнаўства» для студэнтаў першага года навучання. Асноўны акцэнт у ёй зроблены на ўзмацненні тэарэтычнай часткі курса. Тут знайшлі адлюстраванне такія агульныя пытанні гэтай навукі, як азначэнне дакумента, яго субстанцыянальны і функцыянальны статус, функцыі і ўласцівасці, прыметы. Значна больш увагі надаецца спосабам дакументавання, дакументнай камунікацыі, жыццёваму цыклу дакумента. Прапанаваная раней класіфікацыя дакументаў да-

поўнена новымі прыметамі з улікам універсальнасці паняцця "дакумент" і яго існавання ў розных сістэмах.

Другая частка курса «Дакументазнаўства», якая носіць прыкладны характар, таксама пашырана за кошт увядзення такіх новых тэм, як «Дзелавы дакумент», «Галаграфічны дакумент» і інш.

Размеркаванне ў тэматычным плане гадзін па вывучэнні асобных тэм адрозніваецца на розных факультэтах. Так, на факультэце бібліятэчна-інфармацыйных сістэм значна больш гадзін адведзена вывучэнню відаў выданняў, а на факультэце культуралогіі (спецыялізацыя «інфармацыйныя тэхналогіі ў культуры») – дакументам на новых носьбітах інфармацыі.

Атрыманыя веды аб відавым саставе дакументаў паглыбляюцца пры вывучэнні курса "Бібліятэчныя фонды", бібліяграфічных дысцыплін. Звесткі аб структуры розных дакументаў знаходзяць далейшую рэалізацыю ў курсе "Каталагізацыя дакументаў". Каштоўнасныя ўласцівасці дакументаў выкарыстоўваюцца пры вывучэнні асаблівасцей бібліятэчна-інфармацыйнага абслугоўвання розных катэгорый карыстальнікаў інфармацыі.

Такім чынам, у вучэбным плане рэалізаваны прынцып сістэмнасці атрымання ведаў і сучасная канцэпцыя міждысцыплінарнай інтэграцыі. Паколькі дакумент у розных яго відах з'яўляецца неад'емнай часткай большасці відаў дзейнасці ў галіне культуры, відавочна, што асновы дакументазнаўства неабходна выкладаць і на іншых факультэтах.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ